сягненні, перадавы вопыт асобных працаўнікоў, цэлых калектываў. Галоўнае тут, вядома, раскрыць сутнасць гэтага вопыту, зацікавіць ім мільёны людзей, дапамагчы шырока ўкараніць яго. Так ставіць задачу Пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы». Не заўсёды, аднак, так атрымліваецца на практыцы,—працягвае Л. І. Патаповіч.—Ёсць у гэтым і віна наватараў, рабкораў. Часта ў сваіх артыкулах, выступленнях па радыё і тэлебачанню мы больш выхваляемся, чым па-дзеламу раскрываем прынцып барацьбы за ўкараненне новага, прагрэсіўнага» [5].

Заклапочана, з дзяржаўных пазіцый гаворыць вядомы ў нашай рэспубліцы радавы працаўнік пра набалелае, тое, што хвалюе і непакоіць яго ўжо не адзін год. Яго думкі і выказванні—гэта канкрэтная праграма для кіраўнікоў і партыйных работнікаў самага высокага рангу, тых, хто закліканы арганізоўваць і кіраваць не толькі ходам працоўнага саперніцтва, але і ўсім працэсам развіцця сацыялістычнай эканомікі.

Кожнае слова, сказанае з газетных старонак, павінна знаходзіць шырокі водгук у сэрцах чытачоў, адбівацца ў іх свядомасці, усёй практычнай дзейнасці. У газетнай практыцы вельмі важна не проста фіксаваць становішча спраў, а трэба прадбачыць, падказваць далейшае развіццё іх. Аднак публікацыі маладзёжных газет «Чырвоная змена» і «Знамя юности» нярэдка вызначаюцца недастатковай, неглыбокай аргументацыяй. Што ж датычыцца газет «Звязда», «Советская Белоруссия», то на іх старонках вельмі рэдка публікуюцца артыкулы аб тым, як пярвічныя партыйныя арганізацыі ажыццяўляюць кантроль за дзейнасцю кіраўніцтва вытворчасцю.

Ва ўсіх сферах дзейнасці ў сямідзесятыя гады адбыўся паварот да якасных паказчыкаў. І гэта, несумненна, павінна яшчэ больш падахвочваць партыйныя камітэты звяртаць самую пільную ўвагу на ўзровень крытыкі і самакрытыкі ў газеце, на свае адносіны да друкаванага слова. Эфектыўнасць партыйнага кіраўніцтва друкам ў многім залежыць ад таго, наколькі аператыўна і глыбока зможа адпаведны партыйны камітэт прааналізаваць грамадскую значымасць пачына ці ініцыятывы працоўных, распаўсюдзіць яго, нацэліць журналісцкі калектыў на давядзенне гэтай справы да лагічнага завяршэння. Для таго, каб павысіць гэту эфектыўнасць, Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі ў 1979 годзе правёў размеркаванне сфер уплыву газет. Цяпер «Звязда», напрыклад, заклікана адлюстроўваць і сканцэнтроўваць сваю ўвагу на арганізацыйна-партыйнай рабоце, на дзейнасці партыйных камітэтаў па развіццю сельскагаспадарчай вытворчасці, культуры, навукі і г. д. «Советская Белоруссия» ж сарыентавана на прапаганду і пашырэнне перадавога вопыту ў прамысловасці рэспублікі, гандлі, бытавым абслугоўванні насельніцтва... У выніку ўсё радзей на старонках газет сустракаецца дубліраванне, перапеў тэм. Размеркаванне сфер уплыву газет, несумненна, акажа карысць і ў іншым напрамку. Журналісцкія калектывы хутчэй пераадолеюць дробнатэм'е, раскіданасць, газетчыкі больш сканцэнтруюць свае сілы на вырашэнні тых задач, праблем і напрамкаў, якія вызначаны для іх Цэнтральным Камітэтам Кампартыі рэспублікі.

[1] Правда, 1971, 5 сентября.
[2] Звязда, 1974, 31 жніўня.
[3] Звязда, 1978, 20 верасня.
[4] Правда, 1978, 26 апреля.
[5] Советская Белоруссия, 1979, 12 июля.

Я. Р. РАДКЕВІЧ

## ЭТАПЫ РАЗВІЦЦЯ І СТРУКТУРА БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ

Беларускае радыёвяшчанне бярэ вытокі, як і ўсё савецкае радыёвяшчанне, з першых дэкрэтаў Савецкай улады аб радыёсправе, з той пільнай, неаслабнай увагі, якую надаваў ёй У. І. Ленін. Неўзабаве пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі голас Масквы, голас ленінскай праўды даляцеў да аддаленых месцаў нашай Радзімы. Пачулі яго і ў Беларусі.

Як вядома, 15 лістапада 1925 года ў Мінску сабралася грамадскасць беларускай сталіцы, каб адзначыць важную падзею ў культурным жыцці рэспублікі. У гэты дзень адкрывалася першая ў рэспубліцы

шырокавяшчальная станцыя. «Эфір быў узбуджаны радыёхвалямі, якія неслі працоўным БССР перадачу мітынга, прысвечанага рабоце Мінскага перадатчыка» [1]. Гэтае паведамленне газеты «Чырвоная змена» вельмі цікавае ў тых адносінах, што сведчыць аб прамой трансляцыі мітынга і дазваляе зрабіць заключэнне, што першай перадачай Беларускае радыё заявіла аб сабе як аб зусім новым (не толькі ў плане тэхнічных сродкаў, але і ў плане выяўленчым) відзе журналістыкі, дзе разам са словам на слухача працуе гук, дзе выкарыстоўваюцца бясспрэчныя перавагі радыё — імгненнасць і адначасовасць перадачы інфармацыі.

Натуральна, у даным выпадку быў скарыстаны вопыт радыёвяшчання Масквы, якое да таго часу ўжо не аднойчы праводзіла прамую трансляцыю з месца падзей, але гэта паказвае з яшчэ большай відавочнасцю, што ледзь не ў момант свайго ўзнікнення радыёвяшчанне звяртаецца да дакументальных перадач, створаных на матэрыяле сапраўдных падзей.

З самага пачатку сваёй работы Беларускае радыё вызначае шырокае кола актуальных, значных пытанняў, якія падлягаюць сістэмнаму асвятленню. Адной з асноўных задач у тыя дні з'яўлялася мабілізацыя працоўных на сацыялістычнае будаўніцтва. Галоўныя працэсы грамадскага, эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця краіны, пытанні вытворчасці, кааперацыі барацьбы за рэжым эканоміі, за накапленне сродкаў індустрыялізацыі пастаянна знаходзіліся ў полі зроку чатырох радыёгазет, створаных у рэспубліцы: «За бальшэвісцкія тэмпы», «Калгасны заклік», «Камсамолец Беларусі» і «Піянер Беларусі». Час з'яўлення і функцыяніравання радыёгазет ахоплівае перыяд з 1925 па 1932 год. Яго мы і вызначылі як першапачатковы этап развіцця Беларускага радыё.

Яшчэ ў 1931 годзе на рэспубліканскім радыё былі ўпершыню выкарыстаны гуказапісваючыя апараты, што дало новы штуршок развіццю вяшчання. Створаны ў 1933 годзе Рэспубліканскі камітэт па радыёфікацыі і радыёвяшчанню арганізуе радыёвяшчальныя праграмы па ўсіх радыёстанцыях і радыёвузлах Беларусі. Спачатку па іх перадаваліся пераважна інфармацыйныя праграмы, гутаркі, лекцыі, а па меры ўдасканальвання тэхнічных сродкаў пачалі трансліравацца канцэрты, спектаклі, рэпартажы з дэманстрацый, мітынгаў, сходаў. Радыё ператваралася не толькі ў калектыўнага прапагандыста і агітатара, але і ў калектыўнага арганізатара мас.

Гэтыя яго функцыі з асаблівай сілай праявіліся ў перыяд (які мы вызначаем як трэці этап развіцця Беларускага радыё) Вялікай Айчыннай вайны. Другі заканчваецца з яе пачаткам, а пасля часовага перапынку, выкліканага акупацыяй фашыстамі Мінска, перадачы на беларускай мове, звернутыя да народа-змагара, загучалі з Масквы. 1 студзеня 1942 года пачала работу радыёстанцыя «Савецкая Беларусь». Рэдакцыйны калектыў яе быў створаны з пісьменнікаў і журналістаў, накіраваных ЦК Кампартыі Беларусі на гэты новы ўчастак работы як на пярэдні край барацьбы з фашызмам. Спецыфіка радыё спасцігалася ў ходзе работы, галоўная нагрузка клалася на палымянае бальшавіцкае слова. Пачынаючы з першых дзён дзейнасцю радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» кіраваў непасрэдна ЦК КПБ. Расклад яе перадач быў вядомы ўсім падпольным камітэтам партыі і партызанскім злучэнням. ЦК КПБ рэгулярна разглядаў тэматычныя планы рэдакцыі і накіроўваў яе дзейнасць з улікам акалічнасцей і ў адпаведнасці з тымі задачамі, якія вырашаліся партыяй. Дзейнасць радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» у гады Вялікай Айчыннай вайны — адна з самых яркіх старонак у гісторыі Беларускага радыё. Палымяным словам, усімі сродкамі прапаганды радыё распальвала ў сэрцах патрыётаў свяшчэнную нянавісць да ворага, выхоўвала слухачоў на гераічных прыкладах, аб якіх паведамлялі сведкі і ўдзельнікі падзей.

Пасляваенны перыяд Беларускага радыё датуецца 1945—1960 гадамі. Гэта быў час далейшага развіцця беларускай радыёжурналістыкі, удасканальвання форм і метадаў яе дзейнасці. Аднак гэты перыяд адзначаны некаторым адставаннем радыёпрапаганды ад задач таго часу, застоем асобных форм і метадаў вяшчання, што было справядліва асуджана вядомай Пастановай ЦК КПСС ад 29 студзеня 1960 года «Аб паляпшэнні савецкага радыёвяшчання». Гэта пастанова, з якой варта пачынаць адлік навейшага этапа радыёвяшчання Беларусі, дакладна вызначыла далейшыя напрамкі яго развіцця. Падрабязны аналіз узнікнення і ўдасканалення асобных форм, рубрык, жанраў, характэрных для данага перыяду,

уяўляе сабой вялікую цікавасць як для тэорыі, так і для практыкі радыёвяшчання, бо ўтрымлівае вопыт пошуку найбольш эфектыўных, найбольш прамых шляхоў да свядомасці і сэрца слухача. Дастаткова поўнага, закончанага аналізу гэтага прадуктыўнага этапа тэорыя радыёвяшчання яшчэ не дала, і, думаецца, што гэта справа бліжэйшай будучыні.

Мы ж спынімся на характарыстыцы структуры і галоўных напрамкаў дзейнасці Беларускага радыё ў цяперашні перыяд. БССР поўнасцю радыёфікавана. Радыёвузлы абласных цэнтраў і буйных гарадоў абсталяваны апаратурай для шматпраграмнага кабельнага (праваднога) вяшчання. Заводскія, фабрычныя, калгасныя і саўгасныя радыёвузлы далучаны да рэспубліканскай радыёсеткі. У рэспубліцы больш двух мільёнаў радыёпрыёмнікаў і два з паловай мільёны радыёкропак.

Беларускае радыё мае чатыры вяшчальныя праграмы. Дзевяць гадзін у суткі гучаць перадачы па першай, па другой — сем гадзін, якія аддадзены інфармацыйна-палітычнай і музычнай праграме «Крыніцы». Яна працуе па тыпу праграмы «Маяк». Стэрэафанічнае вяшчанне (пяць гадзін у суткі) ажыццяўляецца праз ультракароткахвалявы перадатчык, які перадае галоўным чынам музычныя і літаратурна-драматычныя праграмы. Штодзённа на кароткіх хвалях вядуцца перадачы (адна гадзіна) для нашых суайчыннікаў за мяжой. Акрамя таго, у Беларусі прымаюцца перадачы першай, другой («Маяк») і трэцяй праграм Усесаюзнага радыё. Уласнае радыёвяшчанне ў БССР вядзецца ва ўсіх абласцях, гарадскіх і раённых цэнтрах. Яго аб'ём — 67 гадзін у суткі.

Беларускае радыё актыўна прапагандуе палітыку КПСС і КПБ, рашэнні іх з'ездаў і пленумаў, пастаноў Савецкага ўрада. Усе віды і формы вяшчання — інфармацыйнае, грамадска-палітычнае, літаратурна-драматычнае, дзіцячае, маладзёжнае, музычнае — скіраваны на тое, каб шырока і паслядоўна выхоўваць у савецкіх людзей камуністычную перакананасць, прывіваць мараль новага грамадства, актыўна заклікаць іх да барацьбы за выкананне пяцігадовых заданняў, даваць шырокую магчымасць для культурнага і эстэтычнага развіцця.

Гэту работу вядуць дзевяць галоўных рэдакцый, кожная з якіх мае сваю тэматыку, скарыстоўвае спецыфічныя формы. Галоўная рэдакцыя прапаганды асвятляе самыя розныя пытанні партыйнай, ідэалагічнай, савецкай, прафсаюзнай работы ў наступных асноўных цыклах: «Трыбуна партыйнага работніка», «Расказы пра камуністаў», «Саветы і жыццё», «Прафсаюзныя будні». У праграме «Гэта наш, савецкі лад жыцця» паказваецца савецкая рэчаіснасць, перавагі сацыялістычнай сістэмы перад капіталістычнай, імкненне народаў нашай краіны жыць адзінай дружнай сям'ёй. Папулярнасцю ў слухачоў карыстаецца цыкл «Яны змагаліся за Радзіму», перадачы якога апавядаюць аб бяспрыкладным гераізме савецкіх людзей ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама радыёчасопіс «Для веруючых і няверуючых». Адна з асноўных вартасцей гэтых перадач заключаецца ў тым, што ў іх знойдзена верная форма размовы са слухачом. Не прапаведвання, не дэкларавання агульнавядомых ісцін, а даверлівага, таварыскага, зацікаўленага субяседвання, пры якім нябачны партнёр прызнаецца раўнапраўным удзельнікам размовы і адчуваецца пастаянна як рэальна існуючая асоба.

Рэпартажы, інтэрв'ю, каментарыі, кароткія паведамленні Галоўнай рэдакцыі інфармацыі знаёмяць слухачоў з важнейшымі падзеямі, якія адбываюцца ў Беларусі, ва ўсёй нашай краіне, за яе межамі. Галоўная рэдакцыя народнай гаспадаркі аб'яднала так званыя эканамічныя рэдакцыі, якія вывяраюць сваю дзейнасць па арыентырах дзейснасці, эфектыўнасці перадач, глыбокага пранікнення ў сутнасць праблем, што паўстаюць перад працоўнымі рэспублікі ў іх паўсядзённай дзейнасці па ператварэнню ў жыццё партыйных рашэнняў.

Журналісты рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання вядуць прапаганду беларускай класічнай і сучаснай літаратуры, а таксама літаратур братніх савецкіх народаў, даюць партрэты беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, паведамляюць навіны тэатральнага жыцця, расказваюць пра народныя тэатры. У агульным аб'ёме рэспубліканскага вяшчання больш паловы займаюць перадачы Галоўнай рэдакцыі музычных праграм. Падрыхтоўкай музычных праграм для тэлебачання і радыё вельмі актыўна займаюцца музычныя калектывы Дзяржаўнага Камітэта БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню: хор, створаны ў 1928 годзе, секстэт домр (1932) і канцэртна-эстрадны аркестр (1958).

У 1978 годзе Галоўная рэдакцыя вяшчання для моладзі, вядомая слухачам больш як «Радыёстанцыя «Беларуская маладзёжная», перадала цыкл перадач «Пульс БАМа», за якi групе журналістаў была прысуджана прэмія імя Ленінскага камсамола Беларусі.

Вядома, што радыё валодае выдатнай здольнасцю — на плёнцы захаваць гукі, галасы, шумы ў іх першароднай дакладнасці і чысціні. І ўсё, што нам расказвае карэспандэнт у суправаджэнні «галасоў» самой падзеі, робіцца неаспрэчным дакументам і пераконвае нас рэальнасцю і адчувальнасцю сапраўднага жыцця.

Галоўная рэдакцыя мясцовага вяшчання аналізуе пошту слухачоў, рыхтуе па іх пісьмах тэматычныя перадачы, знаёміць слухачоў з жыццём саюзных рэспублік шляхам абмену перадач паміж Камітэтамі па тэлебачанню і радыёвяшчанню, плануе і кантралюе работу пастаянных карэспандэнтаў, вывучае грамадскую думку і эфектыўнасць праграм, выпускае інфармацыйна-метадычны бюллетэнь «У дапамогу работнікам тэлебачання і радыёвяшчання» (з 1974), дае метадычныя парады і рэкамендацыі работнікам раённага вяшчання. Перадачы Галоўнай рэдакцыі зарубежнага вяшчання ідуць пад рубрыкамі «Сацыяльныя аспекты пяцігодкі», «Айчына вачамі гасцей», «Беларусь на міжнароднай арэне», «Старонка каментатара», «Багацці нашай духоўнай культуры», «Пра моладзь і для моладзі», «Рэпліка фельетаніста» і г. д.

Усёй работай па стварэнню і выхаду ў эфір тэлерадыёпраграм кіруе Дзяржаўны Камітэт Беларускай ССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню. З ліпеня 1957 года выдаецца штотыднёвік «Беларускае тэлебачанне і радыёвяшчанне», у якім публікуюцца праграмы тэлебачання і радыёвяшчвання, а таксама анатацыі на найбольш значныя перадачы.

У штодзённых абласных радыёпраграмах, разлічаных на 36 мінут вяшчання ў суткі, а ў Мінскай вобласці на адну гадзіну, асвятляюцца самыя розныя пытанні гаспадарчага і культурнага жыцця. Асноўная ўвага скіравана на выкананне працоўнымі кожнай вобласці заданняў пяцігодкі. Перадачы рыхтуюць абласныя камітэты па радыёвяшчанню і тэлебачанню, у Мінскай вобласці гэту работу ажыццяўляе Галоўная рэдакцыя радыёвяшчання абласнога Савета дэпутатаў працоўных. У складзе камітэтаў аддзелы паведамленняў, прапаганды, эканомікі, пісьмаў і масавай работы. Некаторыя абласныя радыёкамітэты выпускаюць радыёгазеты «Вячэрні Віцебск», «Вячэрні Гомель», «Вячэрні Магілёў». У раёнах і буйных гарадах Беларусі працуюць на грамадскіх асновах рэдакцыі радыёвяшчання начале з карэспандэнтамі-арганізатарамі. Актыўная форма іх вяшчання — раённыя, гарадскія навіны, па найбольш актуальных пытаннях рыхтуюцца і тэматычныя перадачы.

Як бачым, рэспубліканскае радыё з'яўляецца разгалінаваным ідэалагічным інстытутам, які здольны ўздымаць і асвятляць складаныя палітычныя, ідэалагічныя, гаспадарчыя і культурныя праблемы. Маючы шматгадовую слаўную гісторыю развіцця і ўдасканальвання метадаў работы, абапіраючыся на магутную тэхнічную базу, яно настойліва шукае шляхі найбольш эфектыўнай дзейнасці, каб заўжды апраўдваць высокае прадвызначэнне быць актыўным байцом партыі.

[1] Чырвоная змена, 1930, 14 снежня.